МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

2 сакавіка 2018 № 7

г. Мінск

г. Минск

Аб наданні статусу і катэгорыі
гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.2 пункта 1 артыкула 93 і падпункта 4.2 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзаца другога падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40 "Вопросы Министерства культуры", Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю "1" культурным каштоўнасцям, якія захоўваюцца ва ўстанове "Музей "Замкавы комплекс "Мір":

"Матрыца пячаткі Юрыя Ілініча герба "Урубы". Медна-жалезны сплаў. Ліццё. Агульная вага – 21,6 г. Памеры 18х16х28 мм" (пачатак XVI ст.);

"Шпалера "Паляванне". Воўна, шоўк. Ткацтва. Памеры 247х450 см" (канец XVI ст.);

"Шпалера з выявай сцэны з антычнай гісторыі. Воўна, шоўк. Ручное ткацтва. Памеры 220х320 см" (канец XVI – пачатак XVII ст.);

"Кніга "TOMVS QVARTVS operum M. Tullii Ciceronis, philosophicos eius libros complectens: quorum feriem altera pagina indicabit" (1554 г.);

"Кабінет (шафа). Дрэва, метал. Разьба, коўка. Памеры 186х89х55 см" (XVII ст.);

"Кубак. Срэбра, лігатура. Выцяжка, гравіроўка, пазалота. Агульная вага – 84,73 г. Памеры 7 х 7 х 7,8 см" (XVIII ст.).

2. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю "2" культурнай каштоўнасці "Крыж-энкалпіён. Метал. Ліццё. Агульная вага – 15,01 г. Памеры 4,7 х 2,7 х 0,9 см" (XII ст.), якая захоўваецца ва ўстанове "Музей "Замкавы комплекс "Мір".

Міністр Ю.П.Бондар

Зак. 393.